театров, занятия спортом, живописью и др. В успешном самообразовании важная роль отводится формированию *навыков самоуправления и самотренировки,* что необходимо будущему арт-менеджеру для выполнения разнообразных практических задач в сфере культуры и искусства.

---

1. *Психология* и педагогика: учеб. пособие / под ред. В.И. Жукова [и др.]. – М.: Институт психотерапии, 2004. – 585 с.

2. *Богуславский, М. В.* О педагогических проблемах / М.В. Богуславский, Г.Б. Корнетов // Магистр. – 1992. – Май. – С.16–17.

3. *Пилиповский, В. Я.* Традиционалистско-консервативная парадигма в теории обучения на Западе / В.Я. Пилиповский // Педагогика. – 1992. – № 9–10. – С.106–113.

4. *Менеджер* социально-культурной деятельности: поступление, обучение, карьера / В.Е. Новаторов (авт.-сост.). – 3-е изд., перераб. и доп. – Омск: ОмГУ, 2004. – 115 с.

5. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова. – Мн.: РИВШ, 2004. – 132 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.А. Касап,** *дацэнт,*
**В.І. Саітава,** *дацэнт*

## АРГАНІЗАЦЫЯ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ НА АСНОВЕ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАГА КОМПЛЕКСУ

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне з'яўляецца неабходным кампанентам інавацыйнай дзейнасці па аптымізацыі вучэбнага працэсу. У арсенале сучаснага педагога, выкладчыка вышэйшай школы ёсць шмат друкаваных сродкаў, прызначаных зафіксаваць і перадаць студэнтам веды па вывучаемых дысцыплінах: падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, вучэбна-метадычныя выданні (вучэбна-наглядныя, рабочыя сшыткі, самавучыцелі, хрэстаматыі), а таксама практыкумы, у тым ліку задачнікі, вучэбныя праграмы, вучэбныя камплекты [1]. Аднак іх роля ў кіраванні самастойнай работай

студэнтаў абмежаваная, бо адсутнічае аспект храналагічнага, педагагічнага, рэгулюючага, кантралюючага ўздзеяння на студэнта з боку выкладчыка. Такія задачы можа выконваць комплексны вучэбны дапаможнік, ці вучэбна-метадычны комплекс (ВМК), у якім рэалізуюцца прынцыпы актыўнасці, сістэмнасці, развіцця, узаемадзеяння студэнта і выкладчыка, уліку міжпрадметных сувязей і інш.

Аналіз трактовак паняцця "вучэбна-метадычны комплекс" паказаў, што сярод даследчыкаў няма агульнага падыходу да яго азначэння, структуры і мэтавага прызначэння. Аднак усе аўтары разглядаюць ВМК як комплекс (камплект) вучэбна-метадычных матэрыялаў, прызначаных для лепшага засваення і выкладання вучэбнага матэрыялу. Структура вагаецца ад уключэння ў ВМК заданняў для выканання на занятках у аўдыторыі і метадычных парад па самастойнай працы да ўключэння блока-канспекта лекцый, падручніка, метадычных парад па правядзенні аўдыторных заняткаў (практычных і семінарскіх), тэм курсавых і дыпломных прац, а таксама рэйтынгавага рэгламенту, графіка і формаў кантролю ўсіх работ. Асобныя ВМК выкананы ў форме сумяшчэння блокаў-канспектаў з рабочымі сшыткамі. Галоўнай мэтай ВМК з'яўляецца метадычна дапамагчы студэнту самастойна падрыхтавацца да ўсіх відаў заняткаў. Таму метадычна дакладнае адлюстраванне ў ВМК формаў, зместу, методыкі выканання заданняў і справаздачнасці па самастойнай рабоце з'яўляецца вельмі важным. Для студэнтаў-завочнікаў ВМК маюць яшчэ большае значэнне і павінны мець пашыранае метадычнае забеспячэнне.

ВМК дапамагае выкананню функцый кіравання самастойнай работай: кансультатыўна рэгламентуючай, інфармацыйна арыентуючай, даведачна-інфармацыйнай, арыентацыйна-ілюстрацыйнай, інфармацыйна-дадатковай, экспертнай [2]. Паспяховасць выкарыстання ВМК залежыць і ад таго, наколькі ў ім улічаны не толькі адметнасць і тэматыка курса, але і псіхолага-педагагічныя асаблівасці навучэнцаў, для якіх ён прызначаны. Так, у ВМК для студэнтаў першага курса неабходна прадугледзець заданні, звязаныя з фарміраваннем уменняў канспектаваць літаратуру да семінара, асэнсоўваць лекцыйны матэрыял: адзначаць галоўнае, параўноўваць пункты погляду. Неабходна паступова пераводзіць студэнта з пазіцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'екта навучання ў пазіцыю суб'екта – раўнапраўнага партнёра прафесійных зносін, што звязана з індывідуалізацыяй заданняў і ў той жа час – уменнем працаваць у калектыве. Індывідуалізацыя дасягаецца праз магчымасць выбару студэнтам тэмы навукова-даследчай і курсавой работы, арыгінальнай электроннай прэзентацыі. На старшых курсах узмацняюцца індывідуалізацыя заданняў, іх практычная накіраванасць, пашыраецца выкарыстанне камп'ютэрных тэхналогій. Паспяховае выкананне індывідуальных заданняў патрабуе кансультацый педагога. Але гэта праца пакуль не адлюстроўваецца пры планаванні вучэбнай нагрузкі.

Рэйтынгавы рэгламент, закладзены ў ВМК, з'яўляецца істотным стымулюючым фактарам. Поспех самастойнай работы пры выкананні семінарскіх і практычных заняткаў залежыць ад таго, наколькі поўна і даступна ў ВМК вызначана мэта, распрацаваны метадычныя парады і формы кантролю. Кантроль можа ажыццяўляцца ў формах індывідуальнага і групавога, рубежнага і выніковага, знешняга і ўнутранага, пры гэтым рэалізуюцца кантралюючая, арганізуючая і карэкціруючая функцыі. Самаправерка (унутраны кантроль) адбываецца шляхам уключэння ў ВМК тэставых заданняў розных відаў як па курсе ў цэлым, так і па раздзелах і асобных тэмах, знешні кантроль – праз уключэнне ў ВМК пытанняў да залікаў і экзаменаў.

Такім чынам, ВМК спрыяюць лагічна арыентаванай накіраванасці працэсу навучання. Замацоўваюць яго сувязь з практыкай, забяспечваюць праблемна-даследчы характар навучання.

Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый забяспечвае падрыхтоўку студэнтаў як па агульнатэарэтычных, так і агульнапрафесійных курсах, а таксама і па дысцыплінах спецыялізацый, якія ў рознай ступені спрыяюць развіццю адукацыйнай, камунікатыўнай і прафесійнай кампетэнцыі, маюць пераважна тэарэтычны ці прыкладны характар. Па кожнай дысцыпліне створаны ВМК, агульны ўзровень якіх можна ацаніць як дастаткова распрацаваны, адпавядаючы па напаўненні і структуры патрабаванням, якія прад'яўляюцца вучэбным аддзелам універсітэта, і сучасным тэарэтыка-метадычным уяўленням аб дадзеным відзе вучэбнай літаратуры. Кожны ВМК уключае тыпавую (вучэбную) і рабочую на бягучы навучальны год праграмы, тэматычны план для дзённай і завочнай формаў навучання са спісамі асноўнай і

дадатковай літаратуры, планы семінарскіх, практычных, лабараторных заняткаў са спісамі літаратуры, метадычнымі парадамі па іх падрыхтоўцы, рэйтынгавы рэгламент, каляндарны графік самастойнай работы, тэмы рэфератаў і дакладаў, курсавых і дыпломных работ, тэставыя заданні, даследчыя і творчыя заданні, пытанні для кантролю і самакантролю ведаў. У ВМК дадаткова маюцца пэўныя спецыфічныя кампаненты, якія ўзбагачаюць яго структуру і створаны выкладчыкамі з улікам спецыфікі дысцыплін. Так, у ВМК па курсе "Дакументазнаўства" (1-ы курс) змешчаны блок-канспект лекцый. Шырока практыкуецца ўключэнне ў ВМК класіфікацый дакументаў і бібліяграфічных дапаможнікаў, табліц для запаўнення і іншых наглядных матэрыялаў. Ёсць практыка змяшчаць у ВМК па праблематыцы курса спісы літаратуры, якая знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Важным таксама з'яўляецца выкарыстанне раздатачнага матэрыялу. Напрыклад, у табліцах і схемах прадстаўлены звесткі па важнейшых тэмах курсаў "Бібліяграфазнаўства. Тэорыя", "Дакументазнаўства". Такі матэрыял дапамагае студэнтам не толькі лепш засвоіць веды, але і набыць вопыт іх практычнага прымянення (па класіфікацыі выданняў, бібліяграфічнай прадукцыі і інш.).

Самастойная работа пэўным чынам мяняе традыцыйныя ролі студэнтаў і выкладчыкаў. Ствараецца магчымасць пашырыць дыялогавыя формы зносін: кансультацыі пры выкананні практычных і творчых заданняў, абмеркаванні спрэчных пытанняў.

Істотным для будучай прафесійнай дзейнасці з'яўляецца і тое, што самастойная работа спрыяе фарміраванню ўменняў працаваць у камандзе. Сумесная дзейнасць ажыццяўляецца пры падрыхтоўцы і правядзенні семінараў-дыспутаў, семінараў–круглых сталоў і інш., дзелавых і ролевых гульняў "Аўтапартрэт бібліятэказнаўцы", "Угадай, хто гэта", "У іх і ў нас" і інш. Напрыклад, па дысцыплінах, вывучаемых на 1-м курсе ("Дакументазнаўства", "Сусветная гісторыя кнігі", "Гісторыя беларускай кнігі", "Бібліятэказнаўства. Гісторыя"), семінары праводзяцца па наступных методыках: "рынг", "дзяжурны дацэнт", "мазгавая атака" і інш.

Самастойная работа дапамагае выпрацаваць патрэбнасць у самаадукацыі, якой спрыяюць, у прыватнасці, заданні даследчага характару. Напрыклад, пры вывучэнні курса "Бібліятэказнаўства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыя" студэнты ўдзельнічаюць у даследаванні мала распрацаваных тэм гісторыі бібліятэчнай справы і бібліятэказнаўства Беларусі. Даследчыя заданні па самастойнай рабоце прадугледжаны ў ВМК па большасці дысцыплін спецыялізацыі "Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства", "Сусветная гісторыя бібліяграфіі", "Кіраванне інтэлектуальнай уласнасцю" і інш. На семінарах заслухоўваюцца паведамленні, звязаныя з вывучэннем рэальных аб'ектаў (напрыклад, раздзелаў фондаў рэдкіх і каштоўных выданняў, краязнаўчых фондаў, замежных даведачных і бібліяграфічных выданняў у даведачна-бібліяграфічным апараце бібліятэк, краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, сайтаў і інш.).

Сам тэхналагічны працэс многіх заданняў адпавядае логіцы навучання, калі тэма пачынае распрацоўвацца ў аўдыторыі і завяршаецца ў працэсе самастойнай працы студэнтаў. Самакантроль і кантроль выкладчыка, а таксама калектыўная рэфлексія дазваляюць усебакова і аб'ектыўна ацаніць набытыя веды і ўменні.

Адной з самых распаўсюджаных формаў самастойнай работы і самакантролю ведаў з'яўляецца тэсціраванне. У ВМК па ўсіх дысцыплінах тэсціраванне прымяняецца па асобных тэмах і раздзелах, распрацоўваюцца групавыя і індывідуальныя тэсты. Наспела пытанне арганізацыі ва ўніверсітэце камп'ютэрнага тэсціравання і аказання выкладчыкам неабходнай дапамогі з боку праграмістаў.

Сістэма рэйтынгавага кантролю распрацавана па ўсіх дысцыплінах, аднак поўнасцю выкарыстаць яе магчымасці яшчэ нельга. Яна функцыянуе на ўзроўні бягучага кантролю, але не рэалізуецца цалкам на такіх выніковых формах, як экзамены. Забеспячэнне адпаведным нарматыўна-рэгламентуючым дакументам дазволіла б выкладчыкам прымяняць вынікі рэйтынгавага кантролю на выніковым этапе кантролю ведаў.

Абагульняючы сказанае, адзначым:

– вучэбна-метадычныя комплексы патрабуюць пастаяннага, бесперапыннага абнаўлення і ўдасканалення;

– пажадана разгледзець магчымасці для правядзення студэнтамі кам'ютэрнага саматэсціравання як аднаго з важнейшых кампанентаў самастойнага навучання, а таксама магчымасць выдання рабочых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сшыткаў для выканання практычных заданняў і заданняў па самастойнае рабоце;

– з мэтай метадычнага забеспячэння студэнтаў-завочнікаў вывучыць магчымасць выдання вучэбна-метадычных комплексаў для студэнтаў ФЗН;

– расклад самастойнай работы павінен набыць такі ж афіцыйны статус, як і расклад аўдыторных заняткаў.

---

1. *СТБ ГОСТ* 7.60-2005. Выданні. Асноўныя віды. – Уведз. 2005 – 10 – 01. – Мн.: Дзяржстандарт, 2005. – 44 с.

2. *Пальчевский, Б. В.* Модель готовности к разработке учебно-методических комплексов / Б. В. Пальчевский // Веснік адукацыі. – 2007. – № 5. – С. 3 – 11.

3. *Зуев, Д. Д.* Школьный учебник / Д. Д. Зуев. – М.: Педагогика, 1983. – 240 с.

4. *Лобанов, А. П.* Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А. П. Лобанов, Н. В. Дроздова. – Мн.: РИВШ, 2005. – 107 с.

5. *Сергеенкова, В. В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В. В. Сергеенкова. – Мн.: РИВШ, 2004. – 132 с.

**Н.У. Клімянкова**, *дацэнт*

## ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНЦКІХ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫХ ПРЭЗЕНТАЦЫЙНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ЯК СРОДКУ АКТЫВІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

(матэрыял курса "Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк")

Сучасная бібліятэка, незалежна ад тыпу і віду, не абмяжоўваецца традыцыйнымі функцыямі забеспячэння карыстальнікаў неабходнымі дакументамі і матэрыяламі. Яна ператвараецца ў інфармацыйны цэнтр і цэнтр арганізацыі вольнага часу (змястоўнага, духоўна багатага) людзей, што патрабуе ад яе работнікаў адпаведных уменняў і навыкаў. Гэта, у першую чаргу, – камунікатыўныя якасці асобы. Не менш важныя і здольнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ